ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 62 (1331) ПАНЯДЗЕЛАК, 16-га сакавіка 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90
6 месяцаў . . . 1 р. 80
1 год . . . 3 р. 60
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сакратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ Х.

Кошт асобнага №—2 кап.

Дыктатар Кубы ў „ролі абаронцы" ад комунізму ўсяго сьвету

НЬЮ-ЁРК.— У гутарцы з прадстаўніком газэты „Нью-Ёрк Сэн" дыктатар Кубы, Мачадо заявіў, што за ўсіх хваляваньнях на высьпе Куба і ў існаваньні апозіцыі супроць яго ўраду вінен... СССР. Мачадо акрамя таго, заявіў, што ён „застаецца ў ўлады толькі для таго каб абараніць Кубу і ПАЗШ ад Савецкага Саюзу". Растлумачваючы далей прычыны паўторнага заняцьця ім улады ў другі раз паста прэзыдэнта, Мачадо ўказаў, што ён кіраваўся пры гэтым выключна сьвядомасьцю свайго доўгу ратаваць краіну і ПАЗШ, і заявіў: „застаючыся ў ўладзе, я абараняю ад комунізму ня толькі Злучаныя Штаты, але і ўвесь астатні сьвет".

II пленум ЦК ЛКСМБ

ПАКАЗАЦЬ ЛЕПШЫЯ ВУЗОРЫ РАБОТЫ КОМСАМОЛУ НА ФРОНЦЕ РАБОЧАГА ЗАБЯСЬПЕЧАНЬНЯ

(З дакладу тав. ГУТКІНА)

Зрабіць пералом у рабоце спажыўкоопэрацыі

Кантрольныя лічбы на 1931 год, ры вялізарнай вытворчай програме, азначаюць таксама і пашырэньне спажываньня працоўных мас. Рост заработнай платы прамысловых рабочых нашым народнагаспадарчым пляне 1931 году вызначан у 6 проц., а рабочых чыгункі і транспорту на 8 пр. зьвязку з ліквідацыяй беспрацоўя работу ўцягваецца вялізарная кольасьць членаў сем'яў, якія дагэтуль колі не працавалі. Увесь фонд зарплаты павялічваецца з 12,5 проц. мільярдаў рублёў да 15 мільярдаў. лейшае павышэньне рэальнай заработнай платы і палепшаньне матар'яльнага і культурнага становішча працоўных шчыльнейшым чынам зьвязана з работай у галіне забясьпечаньня, асабліва з работай спажывецкай коопэрацыі, якая яшчэ не спраўляецца, як адзначыў пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б), з задачамі, якія стаяць у перыяд рэконструкцыі.

Рашучыя мерапрыемствы, якія праводзяцца партыяй у галіне вырашэньня мясной проблемы, пашырэньня тэхнічных культур, побач з ростам соцыялістычнай прамысловасьці, даюць магчымасьць ужо ў гэтым годзе значна павялічыць забясьпечаньне асноўных груп рабочых, занятых на важнейшых вучастках соцыялістычнага будаўніцтва.

Спажывецкая коопэрацыя не змагла забясьпечыць сваячасовага і поўнага абслугоўваньня рабочых мас, колгасьнікаў і батрацка-бядняцкае часткі вёскі. Коопэрацыя не змагла як трэба разьмеркаваць фонды, у выніку чаго—малоўныя пласты гарадзкога і вясковага насельніцтва ня былі забясьпечаны таварамі.

У рабоце коопэрацыйных організацый маюць месца праявы нэпманства опортунізму.

Зусім нездавальняюча пастаўлена работа коопэрацыі ў галіне грамадзкага харчаваньня. Недапушчальна слабыя тэмпы разгортваньня прыгарадных коопэрацыйных організацый.

Рад комсамольскіх організацый недаацэньвае ролю коопэрацыі ў соцыялістычным будаўніцтве. Комсамольскія арганізацыі не дапамагаюць замацаваць коопэрацыйную сыстэму, не кантролююць яе работу.

Цэнтральны Камітэт Партыі пастанавіў рэарганізаваць нізавую сетку спажывецкай коопэрацыі. У рабочых цэнтрах рэарганізаваць аб'яднаць рабочую спажывецкую коопэрацыю; палепшыць забясьпячэньне ў колгасах. Цэнтральны Камітэт рашыў арганізаваць у раёнах звыш 2500 закрытых рабочых размеркавальнікаў.

Адсюль задача комсамольскіх арганізацый: узьняць пад свой непасрэдны нагляд работу спажыўкоопэрацыі, лепшых комсамольцаў паслаць у раёны для кіруючай работы ў спажыватварыствах, замацаваць іх там для работы. Сакратарыят Цэнтральнага Камітэту пастанавіў вылучыць 400 комсамольцаў у раёны для кіруючай працы ў спажыватварыствах. Гэтае мерапрыемства неабходна правесьці ў жыцьцё.

Пленум ЦК павінен проста сказаць нашым комсамольцам, што марнасьць, непаваротлівасьць у такіх важнейшых пытаньнях недапушчальны.

Трэба ўстанавіць шырокі кантроль мас комсамольцаў над працай вясковай коопэрацыі, рашуча змагацца з праніканьнем у вясковыя коопэратывы клясава-чужых элемэнтаў—кулакоў і падкулачнікаў.

У гэтай праве неабходна скарыстаць атрады „лёгкай кавалерыі".

Комсамольскім арганізацыям, напэўна, неабходна заняцца такімі пытаньнямі, як збор паёў, культурна-асьветная праца, масавая работа, загатоўкі і шэраг іншых мерапрыемстваў, зьвязаных з палепшаньнем працы спажывецкіх коопэратываў, з забясьпечаньнем рабочых і батрацка-бядняцкай часткі вёскі.

Прыкладнай у гэтай рабоце зьяўляецца Дрысенская комсамольская арганізацыя. Райком комсамолу правёў нацыянальную нараду комсамольцаў, якія працуюць у спажывкоопэратыве. На падставе вопыту і матар'ялаў прынялі шэраг мерапрыемстваў, якія забясьпечылі правядзеньне рэарганізацыі сельскай спажыўкоопэрацыі.

Рашуча павесьці барацьбу з шкодніцтвам у забясьпечаньні

У рабоце закрытых разьмеркавальнікаў—шэраг буйных недахопаў і памылак па прымацаваньню да іх. Разьмеркавальнікі нездавальняюча ўкомплектаваны працаўнікамі прылаўку. Некаторыя закрытыя разьмеркавальнікі страцілі сваё значэньне таму, што пачалі прымацоўваць абы каго, па ўсякіх хадайніцтвах і запісках. Рад закрытых разьмеркавальнікаў ператварыліся ў агульныя крамы з тойжа колькасьцю неразьбярыхі, бясьпляновасьці і з чаргамі. Гэткае становішча назіраецца ў Барысаўскім Цэрабкоопе.

Праца не ўвязвалася з агульна-вытворчым плянам прадпрыемства.

У БССР назіраецца рад момантаў шкодніцкай работы ў сыстэме спажыўкоопэрацыі. Шкодзілі спажывецкай коопэрацыі і ў Белкоопсаюзе, і ў Цэнтрасаюзе. Усю сваю дзейнасьць шкоднікі канцэнтравалі на тым, каб стварыць блытаніну ў тавараправаджаньні і яго плянаваньні.

Падамо адзін прыклад. Тавары, адрасаваныя Тураўскаму таварыству на станцыю Калінкавічы, на працягу доўгага часу накіроўваліся на станцыю Жыткавічы, а ўжо адтуль—на Калінкавічы, якія перадавалі іх Тураўскаму спажыватварыству. Гэтую блытаніну стварылі шкодніцкія элемэнты, якія сядзелі ў Белкоопсаюзе.

Задача нашай комсамольскай арганізацыі: разам з органам НК РСІ зараз-жа ачысьціць спажывкоопэрацыю ад шкодніцкіх элемэнтаў, узмацніць работу ў коопэрацыю лепшых комсамольцаў.

Лепшых комсамольцаў—на працу ў коопэрацыю

Тав. Кагановіч у сваім дакладзе аб выніках сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б), на сходзе маскоўскага актыву сказаў наступнае:

„Дазвольце мала сказаць, што перабудаваліся. Гэта ўжо прытупліся. Калі гаварыць проста, дык трэба з коопэрацыйнай работы выняць ня менш паловы старых коопэратараў і замяніць іх новымі, якія зьвязаны з рабочымі масамі,—добрымі партыйцамі і комсамольцамі. Але, калі прыходзіцца насылаць на гэтую работу, дык сустракаеш супраціўленьне: чаму мяне караюць, чаму пасылаюць у коопэрацыю". З такімі настроямі комсамол павінен весьці рашучую барацьбу.

Пленум ЦК ЛКСМБ павінен вырашыць пытаньне аб мобілізацыі 100 чалавек лепшых комсамольцаў—актыўных на кіруючую работу ў спажывецкую коопэрацыю. Гэта выклікаецца неабходнасьцю ўзмацненьня ўсёй сыстэмы работы коопэрацыі зьверху да нізу. На сёньня, трэба сказаць, сыстэма падрыхтоўкі кадраў для спажывецкай коопэрацыі надзвычай слабая. Комсамол Беларусі павінен неадкладна паставіць перад НК Асьветы пытаньне аб пераглядзе сеткі курсаў і тэхнікумаў, мэтай і напрамку іх вучэбнай праграмы з тым, каб далейшая іх работа была накіравана на хутчэйшую падрыхтоўку і перападрыхтоўку кваліфікаваных пралетарскіх кадраў для спажывкоопэрацыі.

Неабходна зараз прыцягнуць шырока комсамольскія масы да працы коопэрацыйных камісій, павялічыць выбарнасьць комсамольцаў у праўленьня закрытых разьмеркавальнікаў, у праўленьні рабочых коопэратываў і ТПО.

Арганізацыю прыгарадных гаспадарак—у асяродак увагі

У галіне стварэньня прыгарадных гаспадарак нам неабходна асвоіць пад прыгарадныя гаспадаркі 20 тысяч га; засеяць пад гароды 5600 га, пад кармовыя культуры—10.000 га, закласьці 50 тысяч парніковых рам, давесьці малочны гурт да 12.000 галоў, адкарміць 60.000 сьвіней. Комсамол Беларусі павінен дапамагчы выканаць гэтую задачу, бо ад гэтага залежыць становішча рабочага забясьпечаньня ў 1931 годзе.

У прыгарадных гаспадарках назіраецца рад прарываў у падрыхтоўцы да вясеньняй сяўбы, у забясьпечаньні іх цяглавай сілай.

Пленум ЦК павінен зьвярнуць увагу на наступныя асноўныя задачы ў разьвіцьці прыгарадных гаспадарак: а) неадкладна мобілізаваць комсамольскія організацыі на дапамогу прыгарадным гаспадаркам у падрыхтоўцы да вясеньняй пасеўнай кампаніі, б) абвясьціць месячнік штурму па праверцы падрыхтоўкі да вясны ў прыгарадных гаспадарках, прыцягнуўшы да гэтай справы атрады лёгкай кавалерыі, в) дабіцца давядзеньня вытворчых плянаў да рабочых мас прыгарадных гаспадарак, г) комсамольскія колектывы павінны ўзяць шэфства над прыгараднымі гаспадаркамі.

У дапамогу падрыхтоўцы да вясеньняй сельска-гаспадарчай кампаніі ў прыгарадных гаспадарках неабходна стварыць комсамольскія брыгады, брыгады піонэраў і беспартыйнай моладзі.

У разгортваньні работы комсамольскія брыгады ў прыгарадных гаспадарках павінны шырока ўжыць соцыялістычныя формы працы: соцспаборніцтва і ўдарніцтва.

Ліквідаваць прарыў у грамадзкім харчаваньні

У галіне грамадзкага харчаваньня мы дабіліся некаторых посьпехаў: рост сталовак. У апошні час разгорнута работа па організацыі закрытых сталовак на прадпрыемствах і інш. усё-ж становішча грамадзкага харчаваньня, ня гледзячы на рост сталовак, абсолютна нездавальняючы.

Прымацаваныя да сталовак рабочыя ня поўнасьцю абслугоўваюцца. Назіраецца антысанітарнае становішча у сталоўках, незалежна ад якасьці продуктаў, у некаторых сталоўках якасьць абедаў нездавальняючая. Поўнасьцю сталоўкі яшчэ ня прыступілі да ліквідацыі чаргі. Такое зьявішча назіраецца ня толькі ў Менску, але і у іншых гарадох.

Рад фактаў гаворыць аб тым, што прарывы ў грамадзкім харчаваньні можна ліквідаваць тэрмінова. Аб гэтым сьведчыць работа Бярэзінскай комсамольскай організацыі, якая ўзяла на штурм прарывы ў рабоце сталовак, сабрала каля 100 рабочых прапаноў па палепшаньню работы. У выніку—прарыў ліквідаваны.

Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на кантроль за справай сваячасовага забясьпечаньня і правільнага скарыстаньня продуктаў для грамадзкага харчаваньня.

Перад комсамольскай організацыяй стаіць шэраг задач у справе забясьпечаньня пляну кантрактацыі на 1931 год. Комсамолу Беларусі неабходна ўключыць усе звеньні саюзу на пасьпяховае выкананьне пляну кантрактацыі.

Кожны комсамолец павінен павесьці растлумачальную работу сярод колгасьнікаў, бядняцка-серадняцкай часткі аднаасобнікаў аб політычным значэньні адозвы ЦК і СНК БССР. Кожны комсамолец павінен праводзіць шырокую працу па організацыі хвалі сустрэчных плянаў, дабіваючыся іх выкананьня і перавыкананьня, змагаючыся з опортуністычнай практыкай, якая імкнецца скараціць пляны засеву і кантрактацыі. Атрадам „лёгкай кавалерыі" абавязкова практыкаваць налёты на ўстановы, якія займаюцца пытаньнем кантрактацыі.

Сёньня трэба адзначыць, што комсамольскія організацыі зусім слаба працуюць у галіне загатовак жывёлы. На 1930-31 год бюро ЦК партыі вызначыла загатовіць 74.600 тон жывой вагі, у тым ліку—51.600 тон мяса. Процант выкананьня люцаўскага пляну раўняецца 67, а выкананьне гадовага пляну—38,14 проц.

Комсамольскім організацыям неабходна так пабудаваць работу, каб поўнасьцю забясьпечыць выкананьне 70 проц. гадовага заданьня да 1-га красавіка 1931 году.

У адносінах загатоўкі малочных продуктаў трэба сказаць, што мы маем прарыў па віне бязьдзейнасьці Малжывёлсаюзу.

Большасьць плянаў загатоўкі малочных продуктаў не даводзіцца да сяла, да кулацкіх гаспадарак; кулацкім гаспадаркам не даюцца заданьні. Перад комсамолам пастаўлена задача дабіцца павялічэньня загатовак малака і малочных продуктаў, а таксама пашырыць сетку малочных гаспадарак.

Ня лепш справа пастаўлена па загатоўцы бульбы і гародніны. Пляны загатоўкі поўнасьцю ня выкананы, ня гледзячы на павялічэньне ўвозу бульбы ў гэтым годзе з другіх мясцовасьцяй.

Комсамольскім організацыям трэба дамагацца, каб былі складзены ўмовы для работы ў галіне гародніны, змагаючыся з сустрэчнымі перавозкамі гэтай гародніны

Паход за тэхніку—не кампанія

Учора на ранішнім паседжаньні на пленуме працягваліся спрэчкі па дакладу тав. Юрк'янца аб паходзе комсамолу за якасьць і тэхніку.

Пастановы пленуму,—гаварылі выступаючыя ў спрэчках павінны быць конкрэтным плянам дзеяньня комсамолу за аўладаньне тэхнікай, каб мы маглі прыступіць да выкананьня таго, аб чым гаварыў тав. Сталін.

Выступаўшыя ў спрэчках расказвалі аб тым, як комсамольская організацыя вышла ў паход за тэхніку.

Дагэтуль,—гаворыць тав. Канопік,—сакратар комсамольскага колектыву заводу „Комунар" (Менск) на заводзе 300 маладых рабочых, працуючы на варштатах, ва ўдарных брыгадах, ня ведаюць свайго варштату, ня ведаюць процэсу вытворчасьці.

Комсамольскі колектыў заводу патрабуе адчыненьня ў Менску вячэрняга ВТНУ. На заводзе „Комунар", імя Варашылава, „Ударнік" маецца больш 300 маладых рабочых ударнікаў, якія маюць сярэднюю адукацыю. Вячэрні ВТНУ павінен дапамагчы комсамольцам буйнейшых заводаў аўладаць тэхнікай. ВСНГ дагэтуль ня прымае ніякіх захадаў для ажыцьцяўленьня гэтай прапановы. Я лічу, што пленум скажа сваё слова па гэтаму пытаньню.

Аб цікавым вопыце барацьбы комсамолу Барысаву за тэхніку за якасьць расказвае тав. Мазуркевіч. На „Чырвонай Барэзіне" прамфінплян ня выкананы. Моцныя ўдары па прамфінпляну наносіць недахоп сыравіны Комсамольская організацыя фабрыкі высылае комсамольскую брыгаду, якая дамаглася прысылкі матар'ялаў на фабрыку. Фабрыка танула ў браку, быў выпадак, калі 7000 скрынак запалак з-за дрэннай якасьці пайшлі на апал, Комсамольская організацыя організавала заставу браку каб ніводная скрынка браку не пераходзіла з конвэйеру аднаго цэху ў другі. Організавалі комсамольскае дзяжурства ў цэхох і дабіліся значных посьпехаў. На фабрыцы організавана 12 цэхавых і 3 агульна-фабрычных гурткі па вывучэньню машыны і ўсяго вытворчага процэсу.

Нельга дапускаць апашленьня паходу за тэхніку, ператвараць яго ў кампанію абмежавацца толькі гурткамі тэхнікі—гаворыць т. Рубенчык (ЦК ЛКСМБ), а гэта пагроза маецца, як гэта было з комсамольскім культпаходам, які ня быў даведзены да канца. Паход павінен стаць штодзённай працай комсамолу.

Амаль усе выступаўшыя ў спрэчках зьвярталі ўвагу на тое, каб у паходзе за тэхніку было менш барабаннага бою, траскатні, дэкларацыі, больш конкрэтнае працы.

Прыклад таго, як ня трэба праводзіць паход зьяўляецца праца Аршанскай організацыі, стварыўшы гурткі, курсы па тэхніцы, не мобілізавалі ўсю масу комсамольцаў на ўдзел у паходзе за тэхнікай

Ня гледзячы на кароткі час, які прайшоў пасьля дакладу Сталіна, мы ўжо маем вялікую працу ў організацыі за аўладаньне тэхнікай. Мы ўжо можам і павінны гаварыць аб паходзе не ў вогуле, а аб конкрэтных фактах, мы павінны абмяняцца вопытам працы.

„Чырвоная Зьмена" павінна стаць падручнікам ўсяе організацыі ў паходзе за тэхнікай. Гэтага патрабавалі выступаўшыя ў спрэчках.

Ранішняе паседжаньне закончылася заключнай прамовай тав. Юрк'янца.

Пленум заслухаў даклады аб вайсковай рабоце ЛКСМБ тав. Гузікава і даклад тав. Юрк'янца аб паходзе комсамола за якасьць і тэхніку.

Кулакоў-тэрорыстых—да расстрэлу

КАНАТОП 15.—Выезная сэсія Сумскага міжраённага суду вынесла прыгавор па справе былых кулакоў в. Шапавалава. Гэта група на працягу доўгага часу тэрорызавала колгасьнікаў і актывістых-аднаасобнікаў, зрабіўшы звыш 20 нападаў, чым спрабавала затармазіць колектывізацыю вёскі. Хвэдар Анічэнка, які стаяў на чале гэтай шайкі, і двое яго памочнікаў прыгавораны да расстрэлу, астатнія 6 удзельнікаў шайкі прыгавораны да пазбаўленьня волі тэрмінам на 10-8 год.

АБ САВГАСНЫМ БУДАУНІЦТВЕ

Даклад Наркомзема СССР тав. Якаўлева Я.*)

Першае пытаньне—гэта пытаньне аб выніках таго, чаго мы дасягнулі і чаго не дабіліся з мінулага зьезду саветаў да гэтага зьезду саветаў. Асноўныя лічбы і асноўныя факты паданы ў тэзісах. Тут істотна, у дадатак да таго, аб чым сказана ў тэзісах, напомніць вам яшчэ наступнае. Мы пачалі разгортваць новыя саўгасы з 1928 году. Імення тады, у красавіку 1928 г., была ўнесена т. Сталіным прапанова, якая была прынята політбюро Цэнтральнага Камітэта. Гэта прапанова гаварыла: „прыняць прапанову аб арганізацыі ў працягу 3-4 год па РСФСР і Украіне новых буйных саўгасаў па вытворству збожжа ў раёнах, дзе ня могуць быць закрануты новымі саўгасамі сялянскія надзелы, у разьліку на тое, каб да канца гэтага тэрміну мець ад іх гадовае вытворства таварнага збожжа ў разьмеры 100 мільёнаў пуд." Вы ведаеце, як была спаткана нашымі праціўнікамі справа будаўніцтва саўгасаў. Яе ўзялі ў штыхі ўсе нашы ворагі, пачынаючы з кулакоў і буржуазных вучоных і канчаючы правымі опортуністымі. Ніхто іншы, як кіраўнік правых опортуністых Бухарын, змагаючыся з політыкай савецкай улады ў галіне разьвіцьця саўгасаў і колгасаў, заяўляў тады, што „савгасы і колгасы дадуць патрэбную колькасьць збожжа праз 5-10 год, а нам трэба выкручвацца з хлебам цяпер-жа". Ніхто іншы як пан Даярэнка, які лічыцца адным з буйнейшых буржуазных вучоных, заявіў, што „затея" бальшавікоў арганізаваць буйныя збожжавыя саўгасы, якія далі-б за такі малы лік год сто мільёнаў пудоў збожжа, зьяўляецца фантастычнай" затеей". Як апраўдаліся гэтыя опортуністыя і нібы вучоныя, а фактычна шкоднікі, вы ведаеце. Вы ведаеце, што ў 1930 годзе „Зернотрест" ужо арганізаваў 143 саўгасы. Вы ведаеце, што ў 1930 годзе ён меў 1.750 тыс. гект. з севу. Вы ведаеце, што ў 1931 г. ён даў 30 мільёнаў пудоў збожжа. Вы ведаеце, што ў 1931 годзе ён разгортвае сваю гаспадарку так, каб забясьпечыць разам са збожжавай часткай гаспадаркі іншых саўгасаў 190-195 мільёнаў пудоў таварнага збожжа.

Сьледам за „Зернотрестом" на падставе яго практыкі, савецкая ўлада прыступае да разгортваньня новай сеткі жывёлагадоўчых саўгасаў. Тут тэрмін разгортваньня яшчэ меншы, тут тэмпы яшчэ большыя, чым у адносінах збожжавых саўгасаў. І сапраўды, пастанова аб разгортваньні „Скотоводам" на 1.100 тыс. штук была прынята ў самым канцы 1929 г.—на працягу аднаго году „Скотовод" разгортвае гаспадарку ў 140 саўгасаў з 20 мільёнаў гект. зямлі, на 1.200 т. шт. жывёлы 20 сакавіка 1930 г., па прапанове т. Сталіна, Цэнтральны Камітэт ухваляе пастанову аб тым, каб арганізаваць спэцыяльны трэст агульна-саюзнага значэньня „Сьвінавод" пры Наркомземе СССР.

У выніку трох чвэртак году работы да студзеня 1931 году, Сьвінавод арганізуе 350 саўгасаў на тэрыторыі 1.200 тыс. гект, з 218 тыс. шт. гурту. Нарэшце, пастанова аб арганізацыі Маслатрэсту была прынята 27 ліпеня 1930 году. Паспрабуйце да пастановы дастасаваць мерку так званых буржуазных вучоных, а ў сапраўднасьці ня вучоных, а шкоднікаў, якім патрэбны 4 гады, каб разгарнуць гаспадарку з 100 гект. 27 ліпеня 1930 году г. зн. у канцы лета мінулага году, была прынята пастанова аб арганізацыі Маслатрэсту. Гэты трэст к канцу году разгортвае 52 саўгасы на тэрыторыі 1.300 тысяч гектараў зямлі з 60.000 шт. гурту. Нарэшце, трэба ўпамянуць „Овцевод", які разгортвае к канцу 1930 г. 115 саўгасаў з зямельнай плошчай ў 13 мільёнаў гект., з гуртам у 2-7 мільёнаў штук. Вось, таварышы, важнейшыя паказчыкі таго, як савецкая ўлада прыступіла да вырашэньня пытаньня аб арганізацыі буйнога дзяржаўнага сельска-гаспадарчага вытворства і што з гэтага атрымалася.

Гэтым ня вычэрпваецца саўгасная сетка, якая будуецца. Мы маем „Союзсахар", які аб'ядноўвае сетку саўгаса найбольш старых, найбольш арганізаваных. Тут мы маем найвышэйшы ўраджай параўнальна з астатняй сеткай саўгасаў. Гэта сыстэма дала 3 з пал. мільёны цэнтн збожжа і 30 мільёнаў цэнтн. буракоў у 1930 г. Пачынае разгортвацца сетка спэцыяльных культур—бавоўняных, льняных. У 1930 годзе было засеяна ў саўгасах 8 тысяч гект. лёну. 45 тыс. гект. паліўное бавоўны.

Усе гэтыя саўгасы ўжо ў 1930 годзе здалі дзяржаве таварнай прадукцыі на суму больш чым 200 мільёнаў рублёў (у тым ліку 72 мільёны пудоў збожжа, звыш мільёна пудоў мяса, 180 мільёнаў пудоў буракоў, 670 тысяч пудоў бавоўны—валакна.

Галоўныя недахопы ў рабоце збожжавых саўгасаў і галоўныя мерапрыемствы па палепшаньню збожжавае гаспадаркі.

Возьмем перш за ўсё нашы збожжавыя саўгасы. Тут дасягненьняў больш за ўсё з пункту погляду яксасьці. Імення тут упяршыню выпрацаваўся тып буйное гаспадаркі. Імення тут мы ўпяршыню пачалі каваць і выхоўваць новыя кадры і вельмі добрыя кадры. Гэта можна проста сказаць, бо гэта праўда. Але разам з тым, мы не можам сказаць таго, што тут няма недахопаў. І тут недахопы ёсьць, недахопы вельмі буйныя.

Калі ўзяць збожжавую галіну, дык тут мы маем тры групы асноўных недахопаў: па-першае, дрэннае скарыстаньне машын, па-другое, дрэнная арганізацыя уборкі і па-трэцяе—невыстарчальнае ўдаланьне агратэхнікай. „Гвоздь" у лепшым скарыстаньні машын. Я ведаю, што калі гутарка ідзе аб дрэнным ці няпоўным скарыстаньні машын, некаторыя таварышы могуць прыйсьці і сказаць: „дазвольце, чаму-ж вы ўзводзіце паклёп на сваю-ж савецкую гаспадарку ў той час, калі бясспрэчным фактам зьяўляецца тое, што трактар у нас працуе па 2-2,5 тысячы гадзін, а ў амэрыканцаў—400-600 гадзін. Факт, што ва ўсёй Амэрыцы маюцца вялікія гаспадаркі, літаральна адзінкі (амэрыканскія досьледы наліваюць 7 такіх гаспадарак), у якіх трактар працуе больш тысячы гадзін у сельска-гаспадарчы сэзон, а ў нас 2 з паловаю тысячы гадзін—гэта правіла, гэта наша дасягненьне, але разам з тым гэта факт, што ў нас трактары ламаюцца і ў саўгасах і ва МТС так, як гэтага ня трэба рабіць, так, як бываць гэта старая казённая маемасьць.

Мы маем такое становішча, калі 85 проц. трактараў, якія перайшлі ў 1931 год, патрабавалі капітальнага рамонту. Гэта факт. Мы яго ўтаіваць ня можам. На змаганьне супроць такіх фактаў мы павінны мабілізаваць усю масу рабочых. Мы можам падаць дзесяткі прыкладаў злачынна-нядбайных адносін да трактара, комбайна і да любой іншай машыны. Што тут рабіць, якімі лініямі тут можа і павінна ісьці барацьба за тое, каб трактар скарыстоўваўся акуратна.

Першае—пытаньне ёсьць такіх работнікаў, якія яшчэ не навучыліся глядзець на машыну, як на сваю маемасьць, у іх яна яшчэ чужая, з ёю можна абыходзіцца як хочаш нядбайна. У адносінах да такіх асоб патрэбны самія суровыя меры спагнаньня, аж да адданьня пад суд. У выданым урадам наконт гэтага спэцыяльным законе прадугледжваюцца суровыя меры спагнаньня ў адносінах да асоб, якія злачынна-нядбайна адносяцца да машын. Другое—гэта поўная ліквідацыя тых, на надта шматлікіх на шчасьце выпадкаў, калі ў саўгасах і МТС ужываюць абязьлічаньня трактары. У нас часамі любяць ганяцца, не праверыўшы ці забясьпечана гэта з боку тэхнічнага і арганізацыйнага, за апошнім крыкам дасягненьняў. Пачулі недзе стараной, што на транспорце практыкуецца абязьлічка і, зразумела, тут-ды-ж-як, мы можам адстаць ад іншых. Мы ўстанавілі, што ў радзе саўгасаў, радзе МТС ужывалі летась гэтую абязьлічку. Гэта азначае, што трактар стаў у тых саўгасах і МТС безгаспадарчым, гэта азначае, што ў такіх саўгасах няма трактарыстых, якія апекаваліся-б за сваім трактарам, гэта азначае, што няма чалавека, які-б к канцу сэзону адказаў за тое, што з гэтага трактара засталося. З такімі выпадкамі ўжываньня абязьлічаньня трактара трэба паканчыць з усёй рашучай шпаркасьцю, каб людзям сорамна было такія выпадкі паўтараць, пакуль не створыцца патрэбная тэхнічная і арганізацыйная база.

Трэцяе—гэта пытаньне аб кадрах трактарыстых. У нас чамусьці трактарыстых разглядаецца частка, як сэзонных работнік. Гэта абсолютна няправільна. Трактарысты—гэта не сэзонны работнік, а сталы. Калі рабіць так, як гэта бывае ў радзе савгасаў і МТС, калі рыхтуюць на курсах трактарыстых, а восеньню распускаюць, яны разьбягаюцца па ўсёй краіне. пачынаючы вучыць новых і зноў новых трактарыстых пачынаюць ламаць усё спачатку. Таму трэцяе—гэта стварэньне сталых кадраў трактарыстых. Чацьвертае—гэта арганізацыя рамонту.

Работа наших рамонтных майстэрань падобна на малярыйнага хворага, у якога тэмпература то падымаецца, то паніжаецца. Калі справа падыходзіць да ворыва, за веснавой сяўбы, нашы майстэрні працуюць у тры зьмены: тут спаборніцтва, ударніцтва, тут сапраўды ўздым. А калі да сяўбы тры месяцы—нашы рамонтныя майстэрні „адпачываюць". Скажам: „Каб рамонтныя майстэрні, у якіх стаіць каштоўныя імпортныя варштаты, працавалі бесперапынна, каб трактар лячылі тады, калі ў яго нязначныя пашкоджаньні, а не тады калі дабʼюць яго да канца.



Наркомзем СССР тав. ЯКАЎЛЕЎ

І, нарэшце, пытаньне, якое з усім гэтым непарыўна зьвязана, і якое пераходзіць межы сёньнешняга дня—гэта пытаньне аб сыстэме прычэпных машын. У нас няма яшчэ такіх прычэпных машын, якія патрэбны нашым трактарам, нашай гаспадарцы. Мы ў прычэпных машынах паўтараем пакуль машыну дробнай капіталістычнай гаспадаркі, бо так званая буйная капіталістычная гаспадарка ў параўнаньні з нашым збожжасаўгасам ці ў параўнаньні з нашымі жывёлагадоўчымі саўгасамі, нават у параўнаньні з нашым колгасам па сваіх разьмерах зьяўляецца дробнай. І што атрымліваецца ў выніку гэтага? У часе сяўбы трактары загружаны звычайна толькі на 80 проц., уборкі—толькі на 70 проц. Вялікі катэрпілер, які можа ўзяць 6 сяварак, з прычыны дрэннай організацыі сцэпкі пакуль бярэ толькі 5. Два комбайны, якія працуюць з 60 сільным катэрпілерам, не выкарыстоўваюць тэй магутнасьці, якая ёсьць у трактара. У буйнейшай гаспадарцы да трактара звычайна прыстасавана цэлая сыстэма нібы прычэпных, у сапраўднасьці дробных машын, не адпавядаючых нашаму тыпу гаспадаркі.

Калі пытаньне аб выкарыстаньні трактара ставіць ня толькі, як пытаньне сёньняшняга дня, дык трэба будзе ўжо зараз падумаць і па-сапраўднаму папрацаваць над сапраўдным пераглядам таго набору машын, пры якім мы працуем.

Вы ведаеце, што зараз пачынае вылучацца ў нашым інстытуце мэханізацыі сельскай гаспадаркі і саўгасах рад людзей, якія працуюць над стварэньнем новых машын. Так, адзін з рабочых студэнтаў ВТНУ ў вучэбна-вопытным саўгасе, т. Ішчанка, працуе над стварэньнем комбайна з 60-футовым захопам. Яго работа абслугоўвае ўсялякага падтрыманьня, бо ў нашых гаспадарках, на дзесяткаў тысяч гектараў, машыны, якія пераносім да нас ад капіталістых, зьяўляюцца, бяз моўна, ня зусім падыходзячымі, яны знаходзяцца ў вялікай супярэчнасьці з разьмерамі нашай гаспадаркі.

І так, пытаньне аб поўным выкарыстаньні трактараў—гэта пытаньне ня толькі ў тым, каб пакараць дрэннага трактарыстага, які злачынна-нядбайна адносіцца да сваіх абавязкаў, гэта ня толькі пытаньне ў тым, каб стварыць сталы кадр трактарыстых, ня толькі пытаньне ў тым, каб даць па галаве самым грубым чынам тым, хто хоча абязьлічыць трактар, ня толькі пытаньне ў тым, каб асьвятленьне кожнага трактара было ня шляхам „лятучай мышы", а лепшым, ня толькі пытаньне ў тым, каб рацыяналізаваць такія опэрацыі, як папраўка трактара, засыпка насеньня і г. д.—але гэта таксама вялікае пытаньне ва ўсёй сыстэме прычэпных машын. Вось галоўныя пытаньні, зьвязаныя з машынай. Паўтараю, нам, будуючым самую буйную сельскую гаспадарку ў сьвеце, ня сорамна сказаць адкрыта любому нашаму трактарыстаму і мэханіку: ты—авангард, ты—перадавік ня толькі сельскае гаспадаркі СССР, але ўсяго сьвету, але калі ты з плугам, трактарам абыходзішся горш, чым абыходзіўся серадняк са сваей „машынай" у сваёй маленькай гаспадарцы, дык ты чалавек з нашага пункту погляду „няварты", мы цябе перадавіком лічыць ня можам". Вось як тут стаіць справа.

(Працяг будзе)

*) Даецца ў скарочаным выглядзе.

Іх няма ў колёнах змагароў

Слуцкая, Сьмілаўская і Заслаўская комсамольскія організацыі ня ўключыліся па-ударнаму ў бой за кантрактацыю

Як відаць з пададзенага матар'ялу, у Слуцкім, Вузьдзенскім, Грэскім і Заслаўскім раёнах тэмпы працы па рэалізацыі адозвы ЦК і СНК аб кантрактацыі яравога пасеву нездавальняючы.

Пляны кантрактацыі яшчэ ў радзе месц не даведзены да вёсак, колгасаў і аднаасобных гаспадарак, няма глыбокай масавай працы. Райкоопсаюзы, колгассаюзы не перабудавалі сваю працу па-ўдарнаму. Большасьць гэтых раёнаў ня выканала ніводнага проценту плянаў кантрактацыі і, ня гледзячы на такое катастрофічнае становішча з выкананьнем плянаў кантрактацыі, комсамольскія організацыі гэтых раёнаў бязьдзейнічаюць. Ніводная з гэтых комсамольскіх організацый не намеціла мерапрыемстваў для сваёй практычнай працы па рэалізацыі адозвы.

Комсамолія Слуцку, Узды, Грэску і Заслаўя, напружце сілы, узьнімеце тэмпы працы, ліквідуйце прарыў! Руйнуючым ударам разьбейце опортуністычную практыку і стаўку на самацёк у працы па кантрактацыі.

Склалі з сябе адказнасьць

СЛУЦАК. Згодна пляну, Слуцкі раён павінен закантрактаваць: 554 га лёну і 75 га махоркі. На 11-III закантрактавана лёну толькі 10 га і махоркі—24.

Пляны кантрактацыі яшчэ не даведзены да ўсіх колгасаў, а ў аднаасобным сэктары зусім не праводзіцца работа.

Пляны кантрактацыі даводзяцца да колгасаў і вёсак формальна, бяз шырокай масавай працы.

Райкоопсаюз, спасылаючыся на тое, што кантрактацыя збожжавых культур ускладзена на МТС, адмовіўся ад гэтай працы.

У раёне няма вестак аб тым, наколькі выкананы плян кантрактацыі збожжавых культур.

Адозва ЦК і СНК аб кантрактацыі ўсяго яравога пасеву не прапрацавана ў большасьці колгасаў і вёсак. Масы колгасьнікаў і аднаасобнікаў, беднякоў і серадняков, не знаёмы з тымі вялікімі ўкладаньнямі, якія накіроўваюцца партыяй і ўрадам на пасьпяховае выкананьне плянаў кантрактацыі яравых пасеваў.

Брыгада „Ч. З"—Прыбытак, Нохціч

Кожны новы колгас—удар па кулаку

Комсамольцы-фізкультурнікі на пасеўным фронце

Сарвалі плян кантрактацыі

СЬМІЛАВІЧЫ.—Рудзенскі сельсавет Сьмілавіцкага раёну не праводзіць кантрактацыі яравога пасеву. На 10—III па сельсавеце не закантрактавана ніводнага га бульбы і іншых яравых культур. Няма тае вёскі, дзе-б была прапрацавана адозва ЦК і СНК аб кантрактацыі яравых пасеваў. Нават на пленуме сельсавету гэта пытаньне не абгаварвалася.

Колгасы „Савецкая Беларусь", „Чырвоная Зьмена", „Новы Шлях", „Вясёлае жыцьцё" і „Бязбожнік" ня склалі плянаў і не закантрактавалі ніводнага га пасеву.

Рудзенская і Караваеўская комсамольскія ячэйкі ня прымаюць удзелу ў разгортваньні працы па кантрактацыі.

Райком комсамолу да гэтага часу не праверыў, што робяць комсамольскія ячэйкі для выкананьня дырэктывы партыі і ўраду аб кантракцыі.

Малаток

ІДЭІ СТАНОВЯЦЦА ФАКТАМІ

Пяцідзёнка праверкі спаранай язды, абвешчаная ЦК УсеЛКСМ, павінна ператварыцца ў баявы агляд барацьбы за здаровы паравоз

Галоўнейшай задачай усіх комсамольскіх організацый і кожнага комсамольца ў справе палепшаньня работы чыгуначнага транспорту зьяўляецца барацьба за рэконструкцыю транспарту, за ліквідацыю абязьлічанай і за пераход на спараную язду.

ЦК УсеЛКСМ пастанаўляе:

** Абавязаць комсамольцаў-машыністых, пам. машыністых і качагараў не пазьней 15 сакавіка прымацавацца не формальна, а па сутнасьці да паравозаў.*

** Неабходна шырэй разгарнуць соц. спаборніцтва паміж паравознымі і рамонтнымі брыгадамі, рабочымі шляху і г. д. Усякі комсамолец, які злосна ўвільвае ад сапраўднага ўдзелу ў соцспаборніцтве, які пляцецца ў хвасьце, недысцыплінаваны ў вытворчасьці, які не пакаэвае ўзораў лепшай вытворчай работы, які не змагаецца з лятунамі і рвачамі, падлягае выключэньню з радоў УсеЛКСМ.*

** Ячэйкам комсамолу паравоза рамонтных заводаў, майстэрняў і дэпо неабходна забясьпечыць ня толькі колькаснае павялічэньне, але і асабліва якаснае палепшаньне рамонту паравозаў.*

** 3 мэтай барацьбы за бязумоўнае выкананьне экономіі апалу ня менш як на 15 проц. абавязаць комсамольскія ячэйкі і комсамольцаў, якія працуюць на паравозах, больш шырока распаўсюдзіць вопыт, які ў іх ёсьць у галіне экономікі выдаткаваньня апалу.*

** Абавязаць ячэйкі УсеЛКСМ чыг. транспорту на працягу сакавіка і красавіка месяцаў прапрацаваць плян рэконструкцыі сваёй вытворчасьці і давесьці яго да кожнага рабочага, організуючы на аснове гэтага складаньне сустрэчных плянаў, разьвіцьцё гурткоў рацыяналізатараў, утварэньне плянава-апэрацыйных груп і г. д.*

** Абавязаць комсамольскія організацыі чыг. транспорту на працягу сакавіка месяца праверыць правільнасьць выкарыстоўваньня пагрузачна-разгрузачных мэханізмаў.*

** Абавязаць комсамольскія організацыі забясьпечыць ня толькі выкананьне, але і перавыкананьне кантрольных лічбаў лютаўска-сакавіковага набору ў школы ФЗВ У дэкадны тэрмін забясьпечыць пераход комсамольцаў-чыгуначнікаў, якія працуюць на другой рабоце для работы на чыгунцы.*

** Замест станцыйных камітэтаў ЛКСМ утварыць самастойныя ячэйкі цягі, руху, шляху, з цэхавымі ячэйкамі ўнутры іх, закончыўшы гэтую работу не пазьней 20 сакавіка.*

(З пастановы ЦК УсеЛКСМ)

Ударная комсамольская брыгада імя X зьезду ЛКСМБ Жлобінскага дэпо. У овале: ініцыятар брыгады, т. Дзятко, і кіраўнік брыгады—т. Крум

Галкоўскі--Ворша

Лічбы і факты перамог

Пераход чыгуначнага вузла на спараную язду ў нас амаль поўнасьцю ажыцьцёўлены. Зараз да ўсіх пасажырскіх і таварных паравозаў прымацаваны брыгады, як у Воршы, так і ва ўсім раёне.

З 8-мі гаспадарчых паравозаў на спараную язду пераведзена тры.

Вынікам пераходу на спараную язду зьяўляецца зацікаўленасьць паравозных брыгад у становішчы паравозаў. Брыгады сочаць за рамонтам у дэпо і больш ашчадна адносяцца да машын.

Організавана адна комсамольская спараная брыгада і яе паравоз зьяўляецца найлепшым з усяго вузла. Комсамольцы ўваходзяць у паравозныя трыкутнікі.

Дзякуючы таму, што рамонт паравозаў і догляд за імі палепшыўся, сярэдні сутачны прабег пасажырскіх паравозаў павялічыўся з 245 кілёмэтраў (па заданьню) да 267.

Зараз па вузьле праводзіцца месячнік штурму, каб канчаткова ажыцьцёвіць адозву ЦК УсеКП(б) і СНК.

У дэпо працуюць дзьве ўдарныя комсамольскія брыгады па абточцы і консэрвацыі.

25 сакавіка мы праводзім спэцыяльны зьлёт ударнікаў моладзі, на якім падвядзем вынікі практычнага правядзеньня ў жыцьцё адозвы ЦК.

На здымку; Брыгада пасажырскага паравоза, якая перашла на спараную язду (Менск) т.т. Касьцюковіч, Лазарчык і Скуратовіч

Шыўцоў—Жлобін

Прыхільнікаў абезлічкі да адказнасьці

Жлобінскі вузел перашоў на спараную язду 12 лютага. Брыгады былі прымацаваны да 18 паравозаў, але покуль што нічога не зрабілі.

Першыя дні пераходу далі значны эфэкт. Заблішчэлі паравозы. Прымацаваныя да іх брыгады зьнялі ўвесь бруд, які набраўся за час абязьлічанай язды.

Да паравоза ОВ 7147 былі прымацаваны ўдарнікі: Трушкевіч і Кураж. У нерабочы час яны прывялі машыны ў парадак. Аднак, на пярэдадні выезду з паравоза былі зьняты адрамантаваныя ліхтары, а дзяжурны па дэпо выклікаў машыністага без прымацаванага да паравоза памочніка. Такім чынам, толькі што організаваная выязная брыгада, па жаданьню дзяжурнага дэпо тав. Зяленка, была разагнана. Такіх фактаў калі па віне адміністрацыі разганяліся паяздныя брыгады, можна прывесьці шмат. Зараз засталося ўсяго 5 брыгад.

Па ініцыятыве ячэйкі ЛКСМБ дэпо былі організаваны 4 комсамольскія паяздныя брыгады, для якіх патрэбны былі два паравозы. Але адміністрацыя дала толькі адзін. Некаторыя дзяжурныя па дэпо зрываюць працу комсамольскіх брыгад.

Закаранеласьць і бюрократызм адміністрацыйнага пэрсоналу душыць творчую ініцыятыву і энтузіязм комсамольцаў і беспартыйнай рабочай моладзі. Такім чынам дырэктыву ўраду аб пераходзе на спараную язду Жлобінскі вузел не выканаў. Яшчэ і сёньня хварэе 30 проц. паравозаў з-за непаваротнасьці і бюрократычнага кіраўніцтва адміністрацыі чыгункі.

Камісарчык-Гомель

Змагаемся за здаровы паравоз

У зьвязку з пераходам на спараную язду, процант хворых паравозаў Гомельскага вузла зьнізіўся з 48 да 29 проц. Прымацаваныя да паравозаў пільна сочаць за іх рамонтам. Аднак, у гэтай працы маюцца вялікія зрывы.

Кіраўніцтва бюро комсамольскіх ячэек ня здолела стаць на чале актыўнасьці комсамольцаў.

На чыгунцы створаны дзьве комсамольскія брыгады па рамонту паравозаў, з якіх адна скразная. Зараз там організоўваецца скразны соцыялістычны конвэер.

Грамадзкасьць Гомельшчы выпрыняла вялікі ўдзел у ліквідацыі прарыва на транспорце. Звыш 2000 дзён адпрацавана па ачыстцы сьнегу. Аднак трэба сказаць, што адміністрацыя чыгункі не скарыстоўвае рабочых па кваліфікацыі.

ІХ ВУЧАСТАК ЛІКВІДУЕ ПРАРЫВЫ

За апошнія дні ў Гомелі адчуваецца значны зрух у справе конкрэтнай рэалізацыі адозвы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб ліквідацыі прарываў на транспорце.

Заводы „Пролетары“ і „Рухавік Рэволюцыі“ організуюць ўдарныя брыгады па рамонту паравозаў і вагоннага транспорту. Рабочыя „Пролетарыя“ абвясьцілі сябе мобілізаванымі па мобілізацыі прарываў на IX вучастку цягі, 50 рабочых добраахвотна адмовіліся ад выхадных дзён, скарыстоўваючы іх для работы на транспорце.

На „Рухавіку Рэволюцыі“ організаваліся дзьве ўдарныя брыгады з 14 чалавек кваліфікаваных рабочых. Організоўваецца адна масавая брыгада з 75 чал. для дапамогі чыгунцы.

Увесь комсамольскі колектыў заводу „Пролетары“ адмовіўся ад выхадных дзён і абвясьціў сябе мобілізаваным у дапамогу транспорту.

Цішка.

Дабіваемся перамог

Вучні Віцебскай ФЗВ абавясьцілі барацьбу за здаровы паравоз на віцебскім вузьле.

Агульны сход вучняў школы пастанавіў: на працягу лэтаг аасу ўвесьці трохзьменную працу па рамонту паравозаў (г. зн. што паравоз працуе з 8 да 23 гадзін без перапынку), што ўтрая скарачае прастой паравозаў у рамонце. Для пасьпяховага выкананьня гэтых мерапрыемстваў перакінута з навучальных майстэрняў на вытворчасьць 28 асоб „першае групы сакавіковага набору і уліты ў брыгаду выпускной групы, якая працуе на паравозе.

Астатнія групы таксама прымаюць удзел у штурме прарываў. Па запатрабаваньню вытворчасьці патрэбная колькасьць вучняў з навучальных майстэрняў перакідваецца на вытворчасьць для выкананьня розных дапаможных работ (падкатка колаў, ачыстка шляхоў і інш.).

Усе гэтыя мерапрыемствы даюць значныя вынікі ў пасьпяховай ліквідацыі прарываў на вузьле і ў той-жа час не парушаюць нормальнага выкананьня навучальных плянаў школы, бо на гэтую дэкаду складзен спэцыяльны расклад тэорэтычных заняткаў на тры зьмены.

Г—ы.

Сарпоў--Ворша

Паменшылася колькасьць хворых...

Ужо пасьля ўвядзеньня спаранай язды быў адзін выпадак затрымкі таварна-пасажырскага цягніка па віне брыгадзіра Пацёмкіна.

Зараз грамадзкасьць у значнай ступені дапамагае нам праводзіць штурм за здаровы паравоз і ачышчаць шляхі ад сьнегу.

Участковы ўрач заявіў, што пасьля ўвядзеньня спаранай язды рэзка зьнізіўся процант хворых машыністых.

Вазьмеце мётлы..!

—такі загад Леанідава

Аб прарывах на Жлобінскім чыгуначным вузьле, у прыватнасьці ў галіне рамонту і абслугоўваньня паравозаў, „Чырвоная Зьмена“ ня раз ужо пісала. Комсамольская ячэйка дэпо для ліквідацыі прарываў організавала ўдарную скразную брыгаду, якая паказала прыклады больш вішкай працы.

Аднак, прарывы да гэтага часу не ліквідаваны. Жлобінскі РК КП(б)Б і райпрофсоч абвясьцілі месячнік штурму прарываў.

Комсамольская організацыя чыгункі на агульным вузлавым сходзе, прысьвечаным гэтаму месячніку, парашыла скласьці з комсамольцаў, скончыўшых ФЗВ ударную скразную брыгаду па рамонту паравоза.

Калі-ж сэкратар станцыйнага камітэту ЛКСМБ, тав. Дзятко, прышоў да майстра дэпо, Леанідава з прапановай організаваць гэтую брыгаду, дык атрымаў ад яго наступны адказ: „мне комсамольскія ўдарныя брыгады не патрэбны“.

Калі-ж да яго прышлі комсамольцы—машыністыя рухавікоў унутранага згараньня, дык Леанідаў не знайшоў нічога лепшага, як прапанаваць ім узяць мётлы у рукі.

Такім чынам, комсамольская ўдарная брыгада памерла, не пасьпеўшы нарадзіцца.

Нежаданьне Леанідава прызнаваць комуністычныя мэтоды працы на вытворчасьці, простае ігнараваньне дырэктыў ураду аб скарыстаньні кваліфікаванай рабочай сілы накіравана на зрыў выкананьня адозвы ЦК УсеКП(б).

Мы патрабуем, каб адпаведныя організацыі прынялі самыя жорсткія меры да Леанідавых, якія затрымліваюць рост комуністычных форм працы.

Ш. К. і К. Е.



„Я памятнік стварыў сабе нерукатворны...“

ЗА БАЛЬШАВІЦКІ ПРОФІЛЬ ТЭХНІКА

Сярэднія тэхнічныя навучальныя ўстановы павінны даць спэцыялістых, адпавядаючых запатрабаваньням соцыялістычнага будаўніцтва

Неабходна перагледзець програмы сярэдніх тэхнічных навучальных устаноў

ЯКІМ-ЖА ПАВІНЕН БЫЦЬ ПРОФІЛЬ ТЭХНІКА?

(У парадку абгаварэньня)

Буйныя тэмпы разьвіцьця прамысловасьці і сельскай гаспадаркі патрабуюць аўтомобілізацыі краіны, а разам з гэтым і неабходнасьць хутка палепшыць існуючую сетку дарог, больш эфэктыўна скарыстоўваць і інтэнсіфікаваць новае будаўніцтва. Без навучаных адпаведных кадраў зрабіць гэта немагчыма.

Вось некалькі лічбаў і фактаў.

Начрабу 3-га вучастку на гэты будаўнічы сэзон у Гомелі патрэбна 170 тэхнікаў, начрабу 2-га вучастку—звыш сотні. У вышукальных атрадах пры Белгалоўдартрансе працуюць кооператары, настаўнікі—людзі далёкія ад таго, каб весьці дарожную справу. А наш Менскі дар.-буд. тэхнікум дасьць сёлета толькі 50 чалавек! Магілеўскі дар.-буд. тэхнікум нядаўна адчыніўся і пакуль што ня дасьць нічога.

Падрыхтоўка дарожных тэхнікаў пастаўлена дрэнна. Яшчэ не распрацаваны профіль тэхніка ў дапасаваньні да нашых беларускіх умоў. Програма Менскага дар.-буд. тэхнікуму яшчэ надта распылена. Кожны студэнт апошняга (III курсу) уяўляе сабою тэхніка 5-ці спэцыяльнасьцяй: тэхнік па пабудове мастоў, экономіста-плянавік, вышукальнік, дарожны будаўнік і тэхнік-канструктар. Кіраўнікі Галоўдартрансу, лічаць, што экономісты-плянавікі павінны выдзяляцца з асобных спэцыялістаў. Калі даецца праект па экономічнаму вышуканьню дарог цэлага раёну, дык на яго губляецца амаль увесь час. Тады, як гэта толькі невялікая частка з тае працы, якая можа напаткаць кожнага ў практыцы.

Часам даюць выпрацоўваць праекты мастоў прачэпнай сыстэмы, з шарнірнымі аркамі на жалеза-бэтоне ($3\frac{1}{2}$ курс), нешта каля трох пралётаў даўжынёю. А тэхніку якраз з гэтым нікалі ня прыдзецца сустрэцца, бо гэта справа інжынэра вышэйшай кваліфікацыі.

Неправільнае складаньне экономічнага праекту выклікала неабходнасьць у час самой працы скараціць архітэктурны праект.

Плаваючы ў высокіх матэрыях, студэнты зусім забываюць аб самым неабходным, што ў першую чаргу спаткаецца ў працы тэхніка, як будаўніцтва драўляных мастоў простых і жалеза-бэтонных конструкцый, будаўніцтва дарог і г. д.

Няправільна пастаўлена ў тэхнікуме і прапрацоўка экономічнага абаснаваньня будаўніцтва.

Механізацыя працы і аўтотранспарт—вось фундамант, на якім будзе разьвівацца хуткасьць і якасьць дарожнага будаўніцтва, якое адыгрывае асаблівую ролю ў галіне экономічнага разьвіцьця краіны.

Але якраз гэтыя пытаньні зусім слаба выпіваюцца ў праграме, бо няма зараз нават і адпаведных выкладчыкаў.

Такім чынам паўстае цэлы шэраг пытаньняў у галіне самой структуры тэхніка, ў яго профілі, якія карэнным чынам павінны быць прапрацаваны і больш прыстасаваны да самога жыцьця.

У дапамогу павінны прыйсьці Галоўдартранс, інжынэры, тэхнікі, якія ведаюць гэтую справу. Каб выпрацаваць больш жыцьцёвы профіль тэхніка яны павінны сказаць сваю думку на старонках друку.

З. Віньнікаў

Даць кадры гаспадарцы сувязі

15 проц. непасьпяховасьці, а ў пасобных дысцыплінах (электротэхніка, механіка) непасьпяваючых 30—50 проц., шматлікія прагулы даходзяць у пасобных групах да 300—500 гадзін у месяц,—вось баланс Менскага політэхнікуму сувязі да другога сэместру вучобы.

Вучоба з практыкай зусім ня зьвязана. Вопытныя майстэрні не працуюць, няма належнага памяшканьня і прылад.

Каб зьнішчыць непасьпяховасьць падрада ўхвалена арганізаваць гурткі для адстаючых, але гэтыя гурткі па асноўных прадметах, як электротэхніка, матэматыка, радыё-тэхніка і інш., працуюць яшчэ зусім слаба.

На асобных прадметах, як будаўніцтва тэлеграфных і тэлефонных ліній яшчэ не складзены рабочыя пляны і праграмы. За ўвесь час вучобы наладжана толькі адна экскурсія.

Бытавыя ўмовы студэнтаў вельмі цяжкія. Інтэрнат пазбаўлен электрычнага сьвету, вады, дроў і інш.

Многія пункты ўмовы па соц. спаборніцтву не ажыцьцяўляюца, Тэхнікум узяў на сябе абавязак ліквідаваць няпісьменнасьць 100 чалавек, але тут які ў галіне шэфства над колгасам, каб дапамагчы яму правясьці другую бальшавіцкую сяўбу, нічога ня зроблена. Студэнты політэхнікуму ўзялі шэфства над простым аддзелам, але ажыцьцяўленьне ўзятых на сябе абавязкаў ня стала ў цэнтры ўвагі грамадзкіх організацый.

Беларускае кіраўніцтва, ЦП саюзу і парткалектываў сувязі ня цікавяцца жыцьцём тэхнікуму. За ўвесь час ніводная з гэтых організацый не заслухала нават інформацыі аб ходзе вучобы.

Трэба больш увагі зьвярнуць на тэхнікум, які павінен даць кадры для разьвіцьця гаспадаркі сувязі.

Г. Фрыд

„Радыкальныя меры“ для паходу на СССР

Зьбіраюцца граміць савецкую пяцігодку

БЭРЛІН, 13. Орган младо-нямецкага ордэну, „Дэр Юнге Дэйчэ“ зьмясьціў перадавы артыкул аднаго з лідэраў младо-нямецкага ордэну-дэпутата рэйхстагу Абэля, пад загалоўкам: „Антысавецкі фронт“. Абэль, які зьяўляецца прыхільнікам „заходняй орыентацыі“, піша: „яшчэ нядаўна аўторытэтны міжнародны друк сходзіўся на тым, што савецкая пяцігодка пацерпіць крах. Галоўным прадстаўніком гэтай тэорыі зьяўлялася парыская „Матэн“. Гэтая-ж „Матэн“ цяпер заяўляе, што пяцігодка будзе выканана на 80 проц. і што гэта прывядзе да падрыву эўропэйскай і амэрыканскай прамысловасьці.

Адказныя францускія, ангельскія і амэрыканскія колы абгаварваюць радыкальныя меры ў абарону супроць пяцігодкі. Кіраўнікі прамысловасьці сельскай гаспадаркі Англіі, Францыі і Амэрыкі павінны ў цеснай сувязі з урадамі высьвятліць магчымасьці выключэньня савецкіх тавараў з сусьветнага рынку. У якасьці першага кроку маецца на ўвазе сумеснае ўвядзеньне значнага павышэньня пошлін на ўсе савецкія тавары. Сярод дзяржаў павінна, па магчымасьці, быць усеагульнае міжнароднае забараненьне ўвозу савецкіх тавараў, якое павінна разбурыць пяцігодку.

У гэтым фронце ня ўдзельнічае Італія, Нямеччына і Далёкі ўсход. Кіруючыя колы Англіі адносяцца скэптычна да пляну міжнароднага фронту супроць Савецкага саюзу, бо Англія не давярае Амэрыцы і апасаецца здрады Амэрыкі пры ўтварэньні эўропэйскага абарончага блёку супроць СССР.

І якраз, у самым разгары настойлівых імкненьняў аб'яднаньня заходня-эўропэйскіх дзяржаў супроць СССР, урываецца, як бомба, паездка відных прадстаўнікоў нямецкай цяжкой прамысловасьці ў Маскву. Зусім ясна, што повышэньне нямецкай цяжкой прамысловасьці, нямецкага саюзу прамыслоўцаў і нямецкіх фінансавых колаў супроць-пастаўлена спробе ўтварыць антысавецкі фронт заходня-эўропэйскіх дзяржаў. Вопыт у гэтай галіне—вялікі. Але наша задача лічыцца толькі з тым, што патрабуюць ад нас нашы інтарэсы. Антанта сваёй бязглуздай політыкай вэрсальскага ціску прымушае нас форсаваць наш экспорт паграджаючых памерах. Яна нічога ня робіць для аблягчэньня вынікаў пляну Юнга і сусьветнага гаспадарчага крызісу для Нямеччыны. На выпадак выбуху адчаю, пануючага ў Нямеччыне, яна падрыхтоўвае для аказу толькі гарматы і кулямёты. Таму ёй нечага зьдзіўляцца, што многія людзі ў Нямеччыне накіроўваюць свае погляды на ўсход.

Краіны Антанты на чале з Францыяй ня хочуць адмовіцца ад бязглуздага ў політычных і гаспадарчых адносінах вэрсальскага міру і прымушаюць уваходзіць у згоду з бальшавізмам колы, якія нічога супольнага з ім ня маюць. «Таму,—заканчвае Абэль,—будзем патрымліваць ўсё тое, чаго патрабуюць нашы нямецкія інтарэсы“.

Крызіс у Нямеччыне паглыбляеца

БЭРЛІН, Па даных нямецкага кон'юнктурнага інстытуту, здабыча вугалю Рурскай вобласьці за апошні месяц зноў надзвычайна ўпала.

У лютым сутачная здабыча вугалю раўнялася 295,3 тысяч тон, супроць 336,7 у студзені.

Першая дэкада сакавіка паказвае далейшае пагоршаньне гаспадарчай кон'юнктуры.

„Росквіт“ у „шчасьлівай“ Амэрыцы

Да рэволюцыі, каб пазбавіцца ярма царскага ўраду, шмат працоўных былой Расіі шукалі сабе прытулку ў іншых краінах.

Шмат іх папала і ў Амэрыку. Вось ліст аднага з такіх пролетараў, які больш 20 год працуе на амэрыканскага капіталістага. Ён апісвае сапраўднае становішча рабочае клясы ў „свабоднай“ Амэрыцы.

„Здароў В... Навіны ў нашай „залатой“ Амэрыцы такія: 9 мільёнаў беспрацоўных, а з жанчынамі і дзецьмі—больш 20 мільёнаў. Голад і холад з кожным днём усё павялічваецца і павялічваецца так што кожны дзень выкідаюцца тысячамі рабочыя з фабрык і заводаў на вуліцу.

У нас тавараў поўныя полкі, якіх толькі хочаш. Толькі рабочыя купіць іх ня маюць магчымасьці, бо грошай няма, так што прыходзіцца галадаць і быць абадранымі.

У нас беспрацоўныя ходзяць організаваным парадкам да ўраду і патрабуюць ад яго хлеба, работы і прытулку. Але ў адказ яны атрымоўваюць прытулак у турме. Замест хлеба і работы—поліцэйскія дубцы і калецтва ад іхніх коняй.

Зараз урад „стараецца ліквідаваць“ беспрацоўе. Чым? Можа пасылкай на працу, дапамога? Не, зусім гэтага ня думай. Урад толькі ўпяшае беспрацоўных абяцанкамі і перапіскай.

Вось толькі за адзін дзень у горадзе Чыкаго было зарэгістравана 300 тысяч не толькі беспрацоўных, але і бяспрытульных. Абадраныя, галодныя, дрыжаць яны ад голаду і холаду. Каго толькі там ня ўгледзіш: дзяцей, старых, маладых і рабочых рознага ўзросту і розных катэгорый. Ды ня толькі рабочых, а нават сотнямі інжынэраў.

Страшэнныя зьдзекі, голад, холад—усё гэта не паддаецца апісаньню. Беспрацоўныя ходзяць па буржуазных кварталах і зьбіраюць у сьмяцьцёвых скрынях скарынкі хлеба і другія аб'едкі, каб пракарміць сабе і сваіх дзяцей. Зараз урад „дае“ некаторым салдацкія шынэлі і коўдры. Кваліфікаваных белых рабочых пасылае на грамадзкія работы ў першую чаргу. А чорным—дубцы і зьдзекі, таксама ў першую чаргу.

Страшэнны крызіс як у прамысловасьці, так і сельскай гаспадарцы выклікаў банкротства банкаў, якія зараз лопаюцца, як мыльныя пухіры. Ахвярай аднаго з такіх банкаў зрабіўся і я сам. Зьбіраў грошы на чорны дзень, працаваў як чорны вол па 10-12 гадзін у дзень, каб быць хоць крыху забясьпечаным, бо штодня чакаеш, што цябе выкінуць за вароты фабрыкі. Усе мае крывавыя доляры пашлі на карысьць банкіру.

Колькі сьлёз выліла жонка, колькі гора перанёс і я. Але што зробіш, дзе знойдзеш абарону. Дубцы, турма, —вось наша ўзнагарода за ўсё, калі пасьмееш ісьці супроць ураду.

Усе нашы буржуазныя газэты пішуць, што ў вас голад, што ўрад зараз тут расьпявае нябыліцы аб тым, што „у Савецкім Саюзе зьдзекуюцца над рабочымі і сялянамі, заганяюць іх на заводы і ў колгасы бізуном, што у Маскве ў ліпені месяцы ходзяць ў валёнках, бо іншага няма чаго абуць і сьвецяць сваім целам. Усё начальства п'е і гуляе, а народ пагалоўна галадае. Усё няпраўда, што шкоднікі там нейкія, гэта выдумка бальшавікоў

У Лорэнсе (штат Масачузэтс) бастуюць 10 тыс. тэкстыльшчыкаў у знак протэсту супроць капіталістычнай рацыяналізацыі і зьніжэньня зарплаты.
На здымку—Пікет рабочых ля памяшканьня заводу.

зьдзекуецца над рабочымі і сялянамі што поўны турмы, дзе нельга і слова прагаварыць што працуюць пад бізуном бальшавікоў.

Гэтая брахня нам ужо абрыдла і ёй ніхто з рабочых ня верыць. Але мне вельмі цяжка слухаць, калі мой „таварыш“ Аляксандр Малюковіч, які езьдзіў у Савецкі Саюз з дэлегацыяй амерыканскіх рабочых і пабываў ў м. Капылі (Меншчына), і яны расстрэльваюць нявінных людзей“. Ня дзіўна, што капіталістыя пішуць розную нябыліцу, калі свой былы таварыш так гаворыць. Мне гэта вельмі крыўдна слухаць. Цяпер я разумею чаму ён так размалёўвае хлусьню сярод рабочых аб Савецкім Саюзе. Яго паслалі за кошт самога капіталістага таго заводу, нам якім ён працуе. Гэты заклятыя фашысты, гонячыся за долярамі, прадае для буржуазнага друку усею фальш і хлусьню аб Савецкім Саюзе.

У нас у Амэрыцы сапраўдна праца нявольніцкая, што можна бачыць з таго, як голыя і галодныя шукаюць на сьметніках кавалак хлеба.

Пару слоў пішу табе аб маім жыцьці. Працую я, як ты ведаеш, даўно, пятнаццаць год. Працую на адным месцы ў скатабойні на трох машынах па 10—12 гадзін у дзень. Трэба працаваць хутка і без астаноўкі, бо ад машын ідзе конвэер з мясам ва ўпаковачную. Калі працаваць ня будзеш хутка, зараз-жа апынішся за варотамі. А за варотамі ў нас знаходзіцца зараз 12 мільёнаў рабочых бяз усякай працы.

Вечарамі боязна выходзіць на вуліцу, бо рабункі і пакражы кожны дзень. За апошні месяц у нас было 148 рабункаў з узломамі і забойствамі, ня лічачы ўжо меншых.

Працаваў я апошнія тры гады многа і цяжка, не шкадаваў сваіх сіл, зьбіраў трохі грошай на хваробу і чорны дзень. А гэты чорны дзень можа здарыцца ў любую хвіліну. Але дарэмна пайшла мая праца, дарэмна здабываў сваімі крывавымі мазалямі капейку на чорны дзень.

За апошні час у вас лопнула 120 банкаў. Банкіры выяжджаюць на шыях рабочых. Але прыдзе час і мы зробім так, як зрабілі рабочыя ў вас, у кастрычніку 1917 году.

Ф. Б.

Адказны рэдактар—МІХ. ПЛАТАЎ

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599